необходимое количество кадров, укрепить трудовую дисциплину. Руководство МТС, как и в годы первой пятилетки, не было заинтересовано в повышении производительности труда, что не позволяло достичь запланированных показателей урожайности.

На третьем этапе решению возникших проблем уделялось больше внимания, благодаря чему произошли коренные изменения в создании материально-технической базы, необходимой для механизации сельского хозяйства БССР. Неперспективные совхозы были ликвидированы, а их технический парк передан МТС. Вся зарубежная техника была заменена на отечественную. Впервые в районе уменьшилась проблема механизации труда полеводов, занятых производством льноволокна. Однако в данный промежуток времени не удалось решить кадровый вопрос, что продолжало оказывать негативное влияние на эксплуатацию машинно-тракторной техники. Поэтому к концу второй пятилетки руководство БССР не смогло добиться выполнения плановых заданий, принятых на XV съезде КП(б)Б.

**Аляксандр Субоцін** (*Віцебск*)

## ДЗЕЙНАСЦЬ УСЕСАЮЗНАГА АБ’ЯДНАННЯ ПА ГАНДЛІ З ЗАМЕЖНІКАМІ (ТАРГСІН) У СЯННО Ў СЯРЭДЗІНЕ 1930-х ГАДОЎ

Усесаюзнае аб’яднанне па гандлі з замежнікамі (Таргсін) узнікла ў СССР у 1931 г. з мэтай прыцягнення каштоўнасцей і валютных сродкаў для патрэб індустрыялізацыі. З самага пачатку дзейнасць аб’яднання была напрамую разлічана на абслугоўванне замежных грамадзян, але з цягам часу крамы сістэмы Таргсіна сталі даступныя і для савецкіх пакупнікоў: за здадзенае золата і срэбра і атрыманыя з-за мяжы валютныя пераводы яны маглі тут набываць сабе дэфіцытныя тавары.

У айчыннай гістарыяграфіі пытанне дзейнасці Таргсіна ў БССР з’яўляецца маладаследаваным і абмяжоўваецца толькі асобнымі артыкуламі[1]. У той жа час архіўныя фонды Таргсіна ўключаюць у сябе вялікую колькасць дакументаў па яго дзейнасці ў рэспубліцы. У гэтым сэнсе неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на рэгіянальны аспект працы дадзенага аб’яднання, бо акрамя ключавых гарадоў Савецкай Беларусі яно шырока функцыянавала і на перэферыі, у тым ліку і ў Сянно.

[1] Гужалоўскі А. А. Аперацыя «Таргсін»: невядомая старонка гісторыі індустрыязацыі ў БССР // Беларускі гістарычны часопіс. 2021. № 9. С. 3–10 ; Субоцін А. Фармаванне гандлёвай раздробнай сеткі «Торгсіна» ў Віцебску ў пачатку 1930-х гадоў // Працы Цэнтра вывучэння гісторыі гандлю / ТАА «Інстытут рознічных тэхналогій «Менка», Цэнтр вывучэння гісторыі гандлю. Мінск, 2017. Вып. 2. С. 239–244.

У БССР Таргсін пачатак сваёй дзейнасці ўзяў 6 кастрычніка 1931 г., калі была створана Беларуская кантора гэтай гандлёвай арганізацыі[1]. Віцебскае аддзяленне Таргсіна пачало сваю дзейнасць у студзені 1932 г., а ў сакавіку таго ж года быў адчынены яго першы ўнівермаг[2].

Першае ўпамінанне пра дзейнасць Таргсіна ў Сянно мы знаходзім у раённай газеце «Камунар» ад 10 студзеня 1932 г., дзе ў адной з аб'яў даводзілася інфармацыя, што мясцовае аддзяленне Дзяржаўнага банка адкрыла прыём для ўладальнікаў полісаў Амерыканскага страхавога таварыства «Нью Ёрк» з магчымасцю атрымання па іх грошай з ЗША. Полісаўладальнікі маглі атрымаць пераводы як у грашовым эквіваленце, так і таварамі з фонду Таргсіна. Прыём полісаў і квіткоў страхавых узносаў планавалася ажыццяўляць Дзяржаўным банкам да 1 лютага 1932 г[3]. Па прычыне адсутнасці гандлёвай кропкі Таргсіна ў 1932 г. у Сянно атрыманне тавараў полісаўладальнікамі магло адбывацца ў любой даступнай таргсінгаўскай краме рэспублікі.

Заканадаўчае рашэнне аб адкрыцці аддзялення Таргсіна ў Сянно змешчана ў загадзе № 160 па Беларускай канторы ад 16 ліпеня 1933 г. Згодна з гэтым загадам з 1 жніўня 1933 г. арганізоўвалася Віцебская міжраённая база Таргсіна, якая ўключала ў сябе гандлёвыя адзінкі ў Віцебску, Полацку, Гарадку, Бешанковічах, Дрысе, Бігосава, Лёзна, Суражы, Расонах. У склад Віцебскай міжраённай базы ўвайшло і Сянно, дзе прадпісвалася адкрыць адзін універмаг і адзін скупачны пункт пры ім[4]. Непасрэдна ж сама праца ўнівермага Таргсіна і скупачнага пункта ў Сянно пачалася 22 кастрычніка 1933 г.[5]

Пачатак дзейнасці Таргсіна ў Сянно адбываўся ў перыяд найбольшай актыўнасці аб'яднання ў СССР, у тым ліку і ў БССР. У 1933 г. дзяржавай ставіліся новыя планы па актывізацыі скупкі каштоўнасцей у насельніцтва і прыцягненні валюты з-за мяжы, у сувязі з чым гандлёвая сетка і пашыралася з цэнтра на перэферыю, каб знайсці тут новых пакупнікоў. Таксама з 1933 г. пунктам сістэмы Таргсіна акрамя золата ў выглядзе чаканкі і лому было дазволена прымаць у насельніцтва срэбныя каштоўнасці.

Для набыцця тавараў у гандлёвай сетцы Таргсіна жыхары Сянно здавалі каштоўнасці ў мясцовы скупачны пункт. Тут гэтыя каштоўнасці ацэньваў прыёмшчык і выдаваў імянныя таварныя кніжкі з адрыўнымі талонамі на сумы, якія вымяраліся ў спецыяльных таргсінгаўскіх рублях, што па афіцыйным курсе суадносіліся з савецкімі рублямі ў прапорцыі 1,0 : 6,6.

[1] Гужалоўскі А. А. Аперацыя «Таргсін»: невядомая старонка гісторыі індустрыязацыі ў БССР. С. 4.

[2] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 8.

[3] Аб'ява // Камунар / Орган Сенненскага РК КП(б)Б РВК і РПС. 1932. 10 студз. С. 4.

[4] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 37 адв.

[5] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 160. Арк. 6.

Па расцэнках Таргсіна за 1 грам чыстага золата здатчык павінен быў атрымаць 1,29 таргсінгаўскіх рубля, а за 1 грам срэбра 0,014 таргсінгаўскіх рубля[1]. Далей пры аплаце тавара ва ўнівермагу касір зразаў талоны на суму здзейсненай пакупкі.

На самым пачатку дзейнасці Таргсіна насельніцтва Сянно і бліжэйшых вёсак за апошнюю дэкаду кастрычніка 1933 г. здала ў скупачны пункт залатых манет на суму 10,00 руб., лому золата – на 185,89, срэбных манет на 15,19, лому срэбра – на 224,72 руб.[2] Актыўная здача золота і срэбра жыхарамі Сенненшчыны працягвалася ў перыяд з лістапада 1933 г. па ліпень 1934 г. і дасягнула свайго піку ў чэрвені 1934 г., калі скупачны пункт атрымаў максімальную колькасць каштоўнасцей. Ужо праз два месяцы, з верасня 1934 г., здача каштоўнасцей рэзка знізілася (табл. 1). Гэта можна звязаць з тым, што ўсе рэзервы золата і срэбра насельніцтва былі вычарпаныя і людзям не было ўжо чаго несці ў Таргсін, а таксама з пэўным недахопам хадавых тавараў, якія не заўжды можна было знайсці ў Сенненскім універмагу, пра што гаворка пойдзе ніжэй.

*Табліца 1.* **Аб'ём каштоўнасцей, здадзеных насельніцтвам у Сенненскі Таргсін, руб.**[3]

| Перыяд | Золата | | Срэбра | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| | Манеты | Лом | Манеты | Лом | |
| Лістапад 1933 г. | 35,00 | 358,90 | 117,22 | 285,23 | 796,35 |
| Снежань 1933 г. | 120,00 | 355,57 | 281,37 | | 756,94 |
| Сакавік 1934 г. | 100,00 | 137,26 | 35,84 | 113,47 | 386,57 |
| Красавік 1934 г. | 147,50 | 88,97 | 6,79 | 152,00 | 395,26 |
| Май 1934 г. | 280,00 | 164,58 | – | 117,88 | 562,46 |
| Чэрвень 1934 г. | 590,00 | 346,81 | 13,10 | 252,65 | 1202,56 |
| Ліпень 1934 г. | 135,00 | 226,96 | – | 163,64 | 525,6 |
| Верасень 1934 г. | 20,00 | 20,74 | 30,58 | | 71,32 |
| Кастрычнік 1934 г. | 25,00 | 29,59 | 27,37 | | 81,96 |

У цэлым за адзін год (кастрычнік 1933 г. – кастрычнік 1934 г.) у Сенненскае аддзяленне Таргсіна было здадзена золата на суму 4276,14 руб., дзе пераважала бытавое золата, а срэбра на суму 2436,17 руб.[4]

Другой крыніцай фінансавага папаўнення Сенненскага Таргсіна з'ўляліся валютныя паступленні, якія мясцовым жыхарам можна было атрымаць

[1] Осокина Е. А. Золото для индустриализации: «Торгсин». М. : РОССПЭН, 2009. С. 87, 121, 199.

[2] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 121. Арк. 181.

[3] Складзена па: ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 121. Арк. 196–198, 201–203 ; Спр. 139. Арк. 32, 54, 66, 78, 105, 123.

[4] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 139. Арк. 108.

у рэгіянальным аддзяленні Дзяржаўнага банка. Перш за ўсё гэта былі пераводы валюты, якія насельніцтву Сенненшчыны дасылалі з-за мяжы сваякі. Такія пераводы далей у рублёвым эквіваленце можна было атаварыць ва ўнівермагу Таргсіна. Замежныя пераводы прыходзілі на валютны рахунак Таргсіна праз Дзяржаўны банк і Банк для знешняга гандлю СССР, а таксама па чэках і ордэрах, непасрэдна выпісаных на Таргсін. У некаторых выпадках мясцовае насельніцтва праз Сенненскае аддзяленне Дзяржбанка атрымлівала з-за мяжы каштоўныя пакеты.

Ужо ў кастрычніку 1933 г. з ЗША у Сенненскае аддзяленне Дзяржаўнага банка паступіла 40 пераводаў, а з Англіі – 4. На гэтыя пераводы былі выдадзены таварныя кніжкі на сумы 630,5 рубля і 105,05 рубля адпаведна[1]. У лістападзе 1933 г. валютныя пераводы для мясцовага насельніцтва акрамя ЗША і Англіі паступілі з Германіі, Польшчы і Літвы. Лідарам тут заставаліся ЗША: было зроблена 32 пераводы на суму 415,71 руб. дасланы 1 каштоўны пакет на суму 12,73 руб. З Англіі паступіла 2 пераводы на суму 35,75 руб., з Германіі – 1 каштоўны пакет на суму 30,37 руб., з Польшчы – 1 перавод на суму 8,60 руб. і 1 каштоўны пакет на суму 12,5 руб., з Літвы – 1 перавод на суму 9,28 руб. Усяго за месяц паступіла пераводаў на 524,58 руб., з якіх таварных кніжак было выдадзена на суму 410,55 руб.[2]

У цэлым практыка пераводаў з-за мяжы ў Сянно мела станоўчую дынаміку і ў сярэднім штомесяц сюды паступала валюты ў эквіваленце 400 таргсінгаўскіх рублёў, з якіх большую частку ўдавалася выдаць насельніцтву ў выглядзе таварных кніжак. Так, у сакавіку 1934 г. Сенненскі Таргсін атрымаў замежных пераводаў на суму 535,71 руб., у красавіку 1934 г. – 759,29, у маі 1934 г. – 271,06, у чэрвені 1934 г. – 424,20, у ліпені 1934 г. – 451,89, у кастрычніку 1934 г. – 407,12 руб.[3] Трэба адзначыць, што доля грашовых паступленняў з-за мяжы ў сістэму Таргсіна была вышэй, чым пры здачы насельніцтвам каштоўнасцей. Напрыклад, калі за студзень – кастрычнік 1934 г. у Сенненскі Таргсін паступіла золата і срэбра на суму 2976,77 руб., то пераводаў з-за мяжы – на суму 4235,10 руб.[4]

Акрамя пераводаў з-за мяжы валюта ў Таргсін паступала наяўнымі непасрэдна ад замежнікаў, якія маглі ажыццяўляць пакупкі ў Сенненскім універмагу, а таксама ад мясцовага насельніцтва. Па такім відзе валютных паступленняў Сенненскі Таргсін атрымаў, напрыклад, у лістападзе 1933 г. – 77,59 руб., у снежні 1933 г. – 43,51, у сакавіку 1934 г. – 84,92, у красавіку – 73,56, у маі 1934 г. – 45,19 руб. Значна выраслі паступленні валюты летам 1934 г.: у чэрвені Сенненскае аддзяленне Таргсіна атрымала яе на суму

[1] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 121. Арк. 180.
[2] Там жа. Арк. 193.
[3] Там жа. Спр. 139. Арк. 32, 54, 66, 78, 105, 123.
[4] Там жа. Арк. 108.

172,75 руб., а ў ліпені – на суму 137,55 руб.[1] Сярод пералічаных лічбаў наяўнай валюты цяжка вызначыць, якая доля пастулала ад грамадзян замежных дзяржаў, а якая – ад савецкіх грамадзян. Не выключана, што сярод «жывой» валюты, якая прыходзіла ў Таргсін, магла быць і тая, што паступала да савецкіх грамадзян нелегальна. Адкрытая магчымасць набываць тавары за наяўную валюту ў краме Таргсіна, безумоўна, выклікала вялікі інтарэс у мясцовых жыхароў, што і адлюстравалася ў значным росце непасрэдных валютных паступленняў у сярэдзіне 1934 г.

Сенненскі ўнівермаг Таргсіна, як і іншыя падобныя крамы адзначанай гандлёвай сеткі, прапаноўваў пакупнікам шырокі асартымент тавараў розных груп. Тут можна было набыць харчовыя тавары, адзенне і абутак, бялізну, тканіны, гаспадарчыя тавары, парфюмерыю і касметыку, нават будаўнічыя матэрыялы.

Як праходзіў гандаль у Сенненскім універмагу Таргсіна можна прасачыць па табл. 2, дзе пададзены статыстычныя звесткі пра рэалізацыю тавараў за студзень – кастрычнік 1934 г.

*Табліца 2.* **Аб'ём рэалізацыі тавараў у Сенненскім універмазе Таргсіна, студзень – кастрычнік 1934 г., руб.[2]**

| Тавар | Аб'ём рэалізацыі | Тавар | Аб'ём рэалізацыі |
|---|---|---|---|
| Мука | 5745,02 | Плімсолы | 46,90 |
| Крупа | 888,13 | Баваўняныя тканіны | 351,80 |
| Макаронныя вырабы | 112,22 | Суконна-ваўняныя тканіны | 28,06 |
| Цукар | 589,45 | Трыкатаж | 64,73 |
| Кандытарскія вырабы | 45,01 | Мыла гаспадарчае | 30,10 |
| Жывёльны тлушч | 7,60 | Мыла туалетнае | 12,92 |
| Жывёльнае масла | 9,93 | Парфюмерыя і касметыка | 1,29 |
| Раслінны алей | 71,62 | Вінна-гарэлачныя вырабы | 29,90 |
| Рыба-ікорныя тавары | 152,12 | Табачныя вырабы | 192,76 |
| Кансервы | 9,92 | Газа | 46,50 |
| Скураны абутак | 66,83 | – | – |

Зыходзячы з даных табл. 2, можна заўважыць, што самым вялікім попытам у пакупнікоў карысталіся харчовыя тавары, дзе першыя пазіцыі па рэалізацыі займалі мука, крупы і цукар. Ва ўмовах паўгалоднага існавання гэтыя тавары былі самымі неабходнымі для мясцовых жыхароў, якія з'яўляліся асноўнымі наведвальнікамі Сенненскага Таргсіна. На востры попыт адзначаных тавараў указваюць і матэрыялы перапіскі Сенненскага аддзялення

[1] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 121. Арк. 196–198, 201–203 ; Спр. 150. Арк. 26, 32, 54, 66, 78, 105, 123.

[2] Складзена па: ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 139. Арк. 108.

Таргсіна і Віцебскай міжраённай базы. Так, у лісце ад 10 красавіка 1934 г., які паступіў з Сянно ў Віцебск, указвалася праблема недагрузкі ў мясцовы Сенненскі ўнівермаг такіх хадавых тавараў, як мука, пярловая і пшанічная крупы, рыс, цукар і махорка. У лісце ўказвалася, што некаторыя пакупнікі з-за адстутнасці пералічаных тавараў сталі пераафармляць таварныя кніжкі ў Оршу, дзе ў мясцовым Таргсіне такія прадукты меліся ў наяўнасці. Больш за тое адзначалася, што часта сталі падавацца заяўкі на перасылку валютных пераводаў у Аршанскае аддзяленне Дзяржбанка. Канстатаваліся факты хуткага распродажу пшанічнай мукі: у адзін з дзён сакавіка 1934 г. насельніцтвам яе было скуплена 26 мяхоў і не засталося ў наяўнасці. У выніку ўзнікалі і праблемы скаплення неатавараных кніжак, якіх набралася на суму 600 руб.[1] У такой сітуацыі жыхары Сенненшчыны адмаўляліся здаваць золата ў скупачны пункт, што магло падарваць выкананне фінансавых планаў. Як бачым, Сенненскае аддзяленне не мела магчымасцей цалкам задаволіць патрэбы пакупнікоў у харчовых таварах пры залішняй наяўнасці прамысловай прадукцыі, якая мала цікавіла патэнцыяльных наведвальнікаў, таму складвалася сітуацыя пэўнай канкурэнцыі паміж рэгіянальнымі аддзяленнямі Таргсіна як за выкананне гандлёвых планаў, так і за прыцягненне спажыўцоў.

Акрамя праблем, звязаных з недахопам хадавых тавараў, узнікала і праблема іх якасці. У лісце Сенненскага Таргсіна ў Віцебскую міжраённую базу ад 16 красавіка 1934 г. адзначалася, што дасланая у сакавіку мука была значна цямнейшая, чым патрабавалася па нормах адпаведнага гатунку, на што часта скардзіліся пакупнікі і не жадалі яе набываць[2].

У адказ на пералічаныя вышэй лісты Віцебская міжраённая база пайшла насустрач Сянно і дамовілася з Полацкім пуктам «Заготзерно» пра адгрузку дадатковай партыі мукі і пераявяла грашовыя сродкі для яе дастаўкі. Пры гэтым, аднак, база адзначала немагчымасць далейшых датацый і неабходнасць скараціць выдаткі, якія затрачвала Сенненскае аддзяленне Таргсіна[3].

Пералічаныя факты гандлёвай дзейнасці Сенненскага Таргсіна па сутнасці ўскрываюць усе тыя вострыя пытанні, якія ў цэлым існавалі не толькі ў Сянно, але і па ўсіх рэгіянальных аддзяленнях Віцебскай міжраённай базы. Нягледзячы на высокі попыт на асобныя харчовыя тавары, Сенненскае аддзяленне часта не выконвала гандлёвых планаў, якія даводзіла Беларуская кантора. Напрыклад, за студзень 1934 г. план па рэалізацыі бакалейнай сеткі тавараў быў выкананы Сенненскім універмагам толькі на 41,3 %, а па прамысловых таварах – на 13,3 %[4]. Па-першае, усё гэта было абумоўлена

[1] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 139. Арк. 44.
[2] Там жа. Арк. 45.
[3] Там жа. Арк. 50.
[4] Там жа. Спр. 160. Арк. 2.

завышанымі кантрольнымі лічбамі гандлёвых планаў, а па-другое – самім характарам попыту з боку пакупнікоў Таргсіна, калі яны былі гатовы набываць толькі асобныя прадукты харчавання і мінімальна куплялі гаспадарчыя тавары, якія тым не менш працягвалі паступаць ў гандлёвую сетку згодна з даведзеным планам. Пытанні дысбалансу прапановы і попыту ўскладняліся і вялікімі выдаткамі, якія траціла Сенненскае аддзяленне Таргсіна на сваю дзейнасць. За кастрычнік – снежань 1933 г. Таргсін у Сянно рэалізаваў тавараў на 3335 руб., але расходы пры гэтым склалі 8332 руб., што перавышала даходы на 250 %. Для Сянно такія вялікія расходы былі звязаны з транспартнымі выдаткамі, бо дастаўка тавараў сюды ажыццяўлялася чыгунычным транспартам праз станцыю Бурбін і ў некаторых выпадках прыходзілася плаціць за прастоі вагонаў[1].

Кадравы склад Сенненскага аддзялення Таргсіна першапачаткова ўключаў у сябе стаўкі загадчыка ўнівермага, прадаўца, касіра, бухгалтара, вартаўніка і прыёмшчыка ў скупачным пункце. Заробкі супрацоўнікаў былі для таго часу даволі высокія. Так, аклад загадчыка ўнівермага складаў 160 руб., прадаўца – 104, бухгалтара – 140, вартаўніка – 90 руб.[2] Таксама работнікам прадстаўлялілся харчовыя пайкі з фонду Таргсіна ў разліках на савецкую валюту. У сакавіку 1934 г. загадчык універмага атрымаў паёк на суму 2,95 руб., прадавец – на 1,77, касір – на 2,58, прыёмшчык – на 2,95, бухгалтар – на 3,07 руб.[3]

З сакавіка 1934 г. па прычыне неабходнасці змяншэння расходаў на ўтрыманне ўнівермага штатная адзінка касіра была скарочана і яго функцыі перайшлі да загадчыка ўнівермага і бухгалтара, з мая таго ж года ў штаце планавалася пакінуць толькі пасады загадчыка, бухгалтара, вартаўніка і прыёмшчыка[4].

Скарачэнне штату Сенненскага ўнівермага Таргсіна супала з падачай заявы на звальненне ад загадчыцы Мухінай, якая па сямейных абставінах збіралася пераехаць у Мінск з 1 мая 1934 г. Аднак кіраўніцтва Віцебскай міжраённай базы паставіла ёй умову знайсці кандыдатуру на пасаду загадчыка. У адказ Мухіна прапанавала заняць пасаду прадаўцу Гольдзіну, але ён катэгарычна не згаджаўся выконваць функцыі загадчыка і прадаўца і нават напісаў два лісты на імя загадчыка Віцебскай міжраённай базы з адмовай прыняць краму і патрабаваннем дадаткова ўвесці пасаду прадаўца. Пасля такіх лістоў загадчык міжраённай базы Айн згадзіўся захаваць стаўкі загадчыка і прадаўца, але 16 чэрвеня 1934 г. Мухіна падала паўторную заяву на звальненне. Тады Гольдзіну з 1 жніўня ўсё ж прыйшлося заняць пасаду

---

[1] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 160. Арк. 6.
[2] Там жа. Спр. 150. Арк. 12 адв.
[3] Там жа. Спр. 139. Арк. 42.
[4] Там жа. Спр. 150. Арк. 45 адв.

загадчыка ўнівермага і па факце выконваць функцыі прадаўца[1]. Пры гэтым пасля звальнення Мухінай у адносінах да яе ад Віцебскай міжраённай базы быў прад'яўлены грамадзянскі іск за лішнія выдаткі на вяртанне непатрэбных тавараў у Віцебск[2].

Далей кадравае пытанне ў Сенненскім Таргсіне ўскладнялася намерам звальнення з боку бухгалтара Тарановіч, якая таксама збіралася пераязджаць на працу ў Мінск. Кіраўніцтва міжраённай базы ў адносінах да Таранавіч заняла больш добразычлівую пазіцыю і знайшло ёй пасаду на Мінскай базе Таргсіна з рэкамендацыяй дапрацаваць да жніўня 1934 г. і прапанаваць адпаведную замену на месца бухгалтара. Замену Таранавіч знайшла і здала справы ў верасні[3].

Цікавай у гэтай сітуацыі выступае лакальная перапіска паміж бухгалтарам Віцебскай міжраённай базы Валачковічам і Таранавіч, дзе можна заўважыць адносіны блізкага знаёмства і патранату ў адносінах да апошняй з боку віцебскага кіраўніцтва Таргсіна. Пра гэта сведчаць моўныя абароты, якія зусім не дапушчальныя для афіцыйнага стылю. Так, у афіцыйных лістах Валачковіч называе бухгалтара Сенненскага Таргсіна Таранавіч мянушкай «маленькая галоўка», іранізіруючы над яе скаргамі на вялікую колькасць фінансавых справаздач, калі ў перапісцы яна часта ўстаўляла фразу «галоўка маленькая, а рахункі вялікія»[4].

Кадравая праблема ў Сенненскім Таргсіне працягвала заставацца вострай і восенню 1934 г. Па-першае, новы бухгалтар Сцяпанава не зарэкамендавала сябе кваліфікаваным работнікам, няправільна вяла дакументацыю, не ведала нарматыўных дакументаў і не магла афармляць належным чынам валютныя пераводы, на што пастаянна ёй указваў бухгалтар Віцебскай міжраённай базы[5]. Па-другое, вялікая нагрузка, як і чакалася, выпала на новага загадчыка Гольдзіна, які не спраўляўся з выкананнем сваіх функцыянальных абавязкаў, не быў матэрыяльна забяспечаны і напісаў з гэтай нагоды ў Віцебскую міжраённую базу шэраг лістоў. Так, у лісце ад 5 кастрычніка 1934 г. ён указаў на цяжкае матэрыяльнае становішча і неабходнасць забяспечыць яго хлебным пайком, які ён перастаў атрымліваць. Прывядзем тэкст гэтага ліста (арфаграфія і стыль захаваны): «Раней райснаб даваў карткі на хлеб, а зараз не дае, а абавязкі ўсклалі. А хлебны паёк сакрацілі, еле выпросил у райснаб 2 картки по 1.50 [рубля] бухгалтеру и сторожу. А я остаюсь без хлебного пайка, поэтому прошу принять во внимание, что неевши работать не могу. И зная, что такая ответственная работа на меня

---

[1] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 139. Арк. 46, 51, 52.
[2] Там жа. Арк. 95.
[3] Там жа. Арк. 48.
[4] Там жа. Арк. 57, 80.
[5] Там жа. Арк. 95, 101.

возложена, должен райснаб выдавать хлебную карту, а у нас у Сенно оказывается наоборот совершенно небогат. Поэтому прошу принять во внимание всё выше изложенное и посодействовать на Сенненский райснаб, чтобы выдал мне хлебную карту, чтоб я мог работать и не бегать голодный»[1]. 11 кастрычніка 1934 г. Гольдзін напісаў заяву на водпуск па прычыне вострай праблемы ў грошах[2], а 13 кастрычніка, даведзены да адчаю, у адказ на заўвагі па невыкананні плану адправіў ліст наступнага зместу: «Невыкананне плана тлумачу тым, што гэта віна не мая, а больш вас, патаму што нет нужного ассортимента товаров, а вы на наши заявки слабо отзывайтесь... Прашу выслать асобу, якая прыняла бы магазин у самы кароткі час. С 1-га лістапада я на працу не выходжу»[3].

Лісты Гольдзіна паказваюць, у якім ганебным стане ў ходзе сваёй дзейнасці аказаўся Таргсін у Сянно, куды прыходзілі пакупнікі за пэўнымі таварамі, якімі ўнівермаг не мог іх забяспечыць у поўнай меры. Мясцовы Таргсін сутыкнуўся з пытаннем жорстай эканоміі сродкаў, калі прадугледжвалася максімальнае прыцягненне новых каштоўнасцей і валюты пры мінімальных расходах на персанал, які не мог нармальна выконваць сваю працу праз цяжкае матэрыяльнае становішча.

Далейшы лёс загадчыка Гольдзіна і факты таго, якім чынам вырашыліся пытанні далейшага функцыянавання Сенненскага Таргсіна, не вядомы. У архіўных дакументах змяшчаецца толькі інфармацыя, што Віцебская міжраённая база 15 лістапада 1934 г. была ліквідавана, і Сенненскі ўнівермаг стаў падпарадкоўвацца Аршанскай міжраённай базе[4]. Хутчэй за ўсё, ва ўмовах адмены карткавай сістэмы ў 1935 г. патрэба ў Таргсіне ў Сянно паступова адпала і ён быў зачынены, як і ўсе астатнія рэгіянальныя гандлёвыя кропкі гэтага аб'яднання ў канцы года.

Такім чынам, адкрыццё Таргсіна ў Сянно пасадзейнічала здачы з боку мясцовага насельніцтва каштоўнасцей і прыцягненню валютных пераводаў з-за мяжы, чым быў зроблены пэўны ўнёсак у накапленні фінансавых сродкаў для індустрыялізацыі. Пачатак працы Сенненскага Таргсіна супаў па часе з самым актыўным перыядам дзейнасці гэтай гандёвай сеткі ў БССР, і жыхары Сенненшчыны ў першыя месяцы ахвотна неслі каштоўнасці для здачы ў скупачны пункт з надзеяй набыць самыя неабходныя прадукты харчавання і тавары першай неабходнасці. Але цалкам забяспечыць попыт пакупнікоў Сенненскаму ўнівермагу Таргсіна не ўдалося з прычыны частага недахопу ходавых тавараў, дастаўка якіх з Віцебска не заўжды забяспечвалася належным чынам. На лакальным узроўні атрымалася, што Сенненскі

[1] ДАВц. Ф. 940. Воп. 1. Спр. 139. Арк. 118.
[2] Там жа. Арк. 114.
[3] Там жа. Арк. 113–113 адв.
[4] Там жа. Спр. 150. Арк. 57.

Таргсін больш востра сутыкнуўся з праблемамі вялікіх выдаткаў на сваё ўтрыманне. Гэта прывяло да скарачэння штатнага складу ўнівермага і адсутнасці неабходных сродкаў для заахвочвання працы таргсінаўскіх супрацоўнікаў. Акрамя таго, Таргсін у Сянно востра адчуваў недахоп кваліфікаваных кадраў, якія з'язджалі адсюль у Мінск у пошуках лепшага месца для працы і жыцця.

**Пётр Дарашчонак** (*Мінск*)

## МІХАІЛ МІКАЛЕВІЧ ПІЯТУХОВІЧ – ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ, КРЫТЫК

Міхаіл Мікалаевіч Піятуховіч – адзін з нямногіх першапраходцаў, якія стаялі ля вытокаў айчыннай вышэйшай адукацыі. Удзел М. М. Піятуховіча ў арганізацыі работы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пэўны час заставаўся ў цені іншых дасягненняў нашага земляка, якія датачыліся яго багатай літаратурна-крытычнай спадчыны. Нядаўняе святкаванне 100-годдзя старэйшай установы вышэйшай адукацыі краіны (адкрыта ў 1921 г.) можна лічыць значнай падставай для таго, каб узгадаць, як Міхаіл Піятуховіч разам са сваімі калегамі-аднадумцамі пачынаў справу надзвычайнай важнасці – лектарскую і навукова-даследчую працу на беларускай мове.

Нарадзіўся Міхаіл Мікалаевіч Піятуховіч 23 лютага 1891 г. у вёсцы Алексінічы Сенненскага павета Магілёўскай губерні ў сям'і вясковага праваслаўнага святара Мікалая Піятуховіча. Вёска Алексінічы здаўна была адным з найвялікшых населеных пунктаў Сенненшчыны, у ёй па перапісу 1897 г. пражывалі 410 мужчын і 415 жанчын. У вёсцы налічвалася 137 дамоў, дзейнічала Ільінская праваслаўная царква. Мясцовая пачатковая школа спачатку была адкрыта ў вёсцы Шыпы, а ў 1897 г. пераведзена ў Алексінічы. Першыя настаўніцы школы – Даўгаполава і Казырская.

Род Піятуховічаў налічваў нямала адукаваных людзей. Адзін з прадстаўнікоў роду, Канстанцін Іаанавіч, быў у 1911 г. святаром Петрапаўлаўскай царквы ў вёсцы Прошыца. Ён скончыў духоўную семінарыю і пражываў у мястэчку Чарэя[1]. Міхаіл Піятуховіч таксама атрымаў сярэднюю адукацыю, скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю. Неўзабаве здольны да навукі юнак быў залічаны на казённы кошт у Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут. Пасля заканчэння вучобы М. М. Піятуховіч у 1917 г. быў накіраваны ў Петраградскі ўніверсітэт для падрыхтоўкі да прафесарскага звання па кафедры рускай мовы і славеснасці.

---

[1] Памятная книжка Могилёвской губернии на 1911 год. Могилёв : Губернская типография, 1911. С. 205.